# БРАТЫ БЕЛАРУСЫ! ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Рабочыя і работніцы, сяляне і сялянкі, работнікі інтэлігентнай працы, якія знемагаюць пад ярмом фашысцкіх захопнікаў, мужныя партызаны і партызанкі, якія вядуць знішчальную барацьбу з ненавісным ворагам, сыны беларускага народа, якія геройна змагаюцца ў радах доблеснай Чырвонай Арміі і якія ў глыбі нашай вялікай краіны на прадпрыемствах, у лабараторыях і інстытутах куюць смяртэльную для ворагаў зброю!

У дзень 1 Мая — дзень агляду баявых сіл рабочага класа Совет Народных Камісараў Беларускай ССР, Прэзідыум Вярхоўнага Совета Беларускай ССР і Цэнтральны Камітэт Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі шлюць вам брацкае баявое прывітанне.

Дзень 1 Мая 1942 года народы ўсяго свету сустракаюць ва ўмовах самай жорсткай вайны, навязанай свету людаедам Гітлерам.

Совецкі народ дзень 1 Мая 1942 года сустракае ва ўмовах айчыннай, вызваленчай вайны, у жорсткай барацьбе з нямецкімі, фінскімі, румынскімі і іншымі захопнікамі свяшчэннай совецкай зямлі.

Беларускі народ гэты дзень адзначае ў цяжкіх крывавых умовах нямецкай акупацыі. Ужо больш 10 месяцаў, як лютуюць у Беларусі орды нямецкіх людаедаў. Няма межаў, няма меры злачынствам гітлераўскіх бандытаў, якія імкнуцца зламаць супраціўленне свабодалюбівага беларускага народа і ператварыць яго ў нявольнікаў нямецкіх памешчыкаў і баронаў.

Ворагу часова ўдалося акупіраваць Совецкую Беларусь, але ніякі тэрор не запалохае і не спыніць беларускага народа ў яго бязлітаснай барацьбе з заклятым ворагам. Беларускі народ бесперапынна ўзмацняе барацьбу з нямецкімі акупантамі. У дзень 1 Мая ён з новай сілай абвесціць: «Смерць нямецкім акупантам», і яшчэ раз паклянецца не шкадаваць сваіх сіл і жыцця для разгрому ненавіснага ворага.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поуным тэкстам
дакумента можна
азнаеміцца у бібліятэцы